этом причастность к миру искусства, а также служит гарантией подлинности культурного продукта для заказчика и потребителя.

Практика использования персонального бренда на рынке культурных продуктов и услуг за рубежом является актуальной. В настоящее время можно наблюдать заметное увеличение конкурентной борьбы в этом секторе экономики. Для Беларуси технологии персонального брендинга, на наш взгляд, также могут быть перспективными.

СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Захаренко, И. Брендинг / И. Захаренко. – М. : Юрайт, 2016. – 440 с.

2. Коваленко, О. С. Менеджмент галерейно-выставочной деятельности : учебно-методический комплекс по учебной дисциплине для специальности II ступени высшего образования (магистратура) 1-20 80 01 Арт-менеджмент / О. С. Коваленко. – Минск, 2019. – 62 с.

3. Маслова, В. М. Формирование и продвижение персонального бренда / В. М. Маслова // Экономические науки. Образование. Наука. Научные кадры. – 2020. – № 2. – С. 150–152.

4. Рябых, А. В. Персональный бренд. Создание и продвижение / А. В. Рябых, Н. Зебра. – М. : Манн, Иванов и Фербер, 2014. – 304 с.

5. Эффективные стратегии продвижения персонального бренда в 2020 году [Электронный ресурс] / MAVP – Блог маркетингового агентства МАВР. – Режим доступа: https://vlada-rykova.com/prodvizhenie-personalnogo-brenda/. – Дата доступа: 05.03.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Силивончик К. И., студент 114 группы
Научный руководитель – Котович О. В.,
старший преподаватель

**АСАБЛІВАСЦІ СВЯТКАВАННЯ**
**КАЛЯД НА БРЭСТЧЫНЕ: АБРАД «КОНІКІ»**

Для продкаў сучасных беларусаў Каляды былі галоўным зімовым святам, які быў звязаны ў першую чаргу з днём зімовага сонцастаяння і сімвалізаваў пачатак новага года. Аўтары кнігі “Зімовыя святы” А. Катовіч і Я. Крук адзначаюць: “На працягу шматлікіх стагоддзяў былі выпрацаваны адпаведныя рытуалы, розныя абрадавыя дзеянні, высокамастацкія велічальныя песні, атрыбуты (у тым ліку свяшчэнныя, якім надаваўся магічны сэнс), гульні і ігрышчы моладзі” [2, с.26].

Можна без перабольшвання адзначыць, што галоўнымі ўдзельнікамі і выканаўцамі калядных абрадаў былі калядоўшчыкі – гурт моладзі, якія “пераапраналіся ў незвычайныя строі, бралі з сабой казу і з песнямі-віншаваннямі абыходзілі па парадку ўсе вясковыя хаты” [2, с. 43]. Адным з галоўных персанажаў гэтага гурта была “каза”. Як сцвярджае даследчык традыцыйнай беларускай культуры А.І. Гурскі: “Вывучэнне дахрысціянскіх культаў паказала, што “каза” у старажытнасці шанавалася за яе нібыта здольнасць узмацняць урадлівасць зямлі. Адсюль і паходзяць магічная роля “казы” устаражытнай навагодняй абраднасці і звязаныя з ёю забабонныя спробы людзей выкарыстаць сілу жывёлы для паляпшэння ўрадлівасці палёў” [1, с. 23].

Неабходна адзначыць, што ў розных рэгіёнах Беларусі ролю жывёлы, якая павінна была ўзмацніць апладняльную сілу і ўрадлівасць зямлі, выконвалі іншыя жывёлы, напрыклад, мядзведзь, або птушкі, напрыклад, жораў. Для Брэсцкага Палесся характэрна шырокае распаўсюджванне і добрая захаванасць каляднай традыцыі. Аднак “…мікралакальную традыцыю, уласцівую толькі г.п. Давід-Гарадок Столінскага раёна, складаў абход з удзелам пераапранутых – конікаў” [3, с. 26]. Па словах даследчыка А.І. Гурскага: “Некалькі менш распаўсюджаны ў беларускім калядаванні ваджэнне “каня” (“кабылы”)… Уключэнне каня (кабылы) у магічныя дзеянні каляднага цыкла, напэўна, абумоўлена важнай гаспадарчай роляй гэтай жывёлы ў сялянскім быце” [1, с. 24].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Давыд-Гарадку Столінскага раёна Брэсцкай вобласці абыход двароў адбываўся адвячоркам на Другой куццю, 13 студзеня, на стары новы год, або на  Шчодры вечар, Шчадрэц – менавіта так называюць гэты вечар мясцовыя людзі. Сам абрад абыходу двароў тут атрымаю назву “Конікі”, дзякуючы аднаму з галоўных персанажаў. Акрамя яго ў гурце ролі размяркоўваліся наступным чынам: “дзед” і “баба”, “казёл”, “смерць”, “бусел”, “баран”, “чорт”, “мядзведзь” і “скарбнік” – разнастайныя зааморфныя і антрапаморфныя персанажы.

Па словах мясцовых жыхароў “коніка” рабілі з 2-х лазовых кошыкаў, змацаваных паміж сабой. Да гэтай канструкцыі далучалі стары валёнак з доўгай халявай, з якога рабілі морду і шыю каня. Валёнак абшывалі  белай тканінай, якую называлі “коленшчына” (можа таму, што гэта была колішняя, г.зн. старая саматканая вынашаная і адбеленая з цягам часу прасціна або кусок палатна ад старой кашулі). Зверху на валёнак, абшыты белай тканінай, прымацоўвалі чорную грыву, якую рабілі са старога кажуха. Каню малявалі вочы чорным вугалем. Кошыкі пакрывалі белай тканінай так, каб паміж імі мог улезці хлопец, які выконваў ролю вершніка на кані. Прымацоўвалі званочкі, стужкі і іншыя ўпрыгожванні. Той, хто насіў на сабе канструкцыю каня, рабіў абутак з шыпамі кавальскай работы, каб было лёгка бегаць і не падаць на лёдзе, у руках абавязкова трымаў пугу. “Конік” вёў за сабой увесь гурт і першы пачынаў спяваць.

“Дзеда” апраналі ў доўгую світку, старую шапку, прымацоўвалі доўгую сівую бараду. Ён звычайна іграў на гармоніку (калі ўмеў), курыў трубку. “Баба” таксама павінна была быць апранута ў світку, паверх якой была доўгая кветастая хустка. Яна бегала побач з “Дзедам”, увесь час хапала яго пад руку, каб утваралася пара. Пераапранутыя пад дзеда і бабу персанажы ў дадзеным выпадку сімвалізавалі сабой тых першапродкаў, ад якіх і пайшлі людзі.

Персанаж “казла” апраналі ў вывернуты кажух, на галаву прымацоўвалі рогі. Ён павінен быў ўвесь час скакаць і “мэкаць”,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“зарабляючы” сваім танцам падарункі ад гаспадароў хаты, куды завітаў гурт. У пару да “казла” ў вывернуты кажух апраналі “барана”, на вывернутую шапку прымацоўвалі скручаныя рогі. Ён павінен быў “бэкаць” і біць у бубен. “Баранам” апраналі хлопца, які быў ніжэй, меншы за таго, хто выконваў ролю “казы”, каб разам гэта пара жывёл была падобна на сапраўдных. Калі ўсе “правілы” былі выкананы, гэтая пара выглядала вельмі натуральна, таму была даволі камічнай.

Цікавым персанажам гурта быў “мядзведзь”. Па словах даследчыка Т. Б. Варфаламеевай: “Для “мядзведзя” рабілі спецыяльную маску: спачатку з пластыліну вылеплівалі макет, пасля яго абклейвалі газетай і белай паперай, фарбавалі лакам. Апраналі кажух навыварат, на ногі надзявалі боты ці валёнкі вялікага памеру, каб “мядзведзь” быў больш няўклюдным, непаваротлівым” [3, с. 49].

Сярод персанажаў гурта асабліва выдзяляўся “бусел”, якога апраналі ва ўсё белае, выраблялі доўгую чырвоную дзюбу. Дзеля гэтай ролі шукалі хлопец высокага росту. На Беларусі вельмі любілі і паважалі гэтую птушку. Лічылася, што яна спрыяе каханню, шлюбу, нараджэнню дзетак. Таму гэты вобраз стваралі добрым. І кожны з прысутных жадаў пастаяць побач з “буслом”, пагладзіць яго па галаве, патрымаць за крыло.

Адным з самых жахлівых персанажаў гурта была “смерць”, якую апраналі ў балахон з прарэзанымі дзіркамі для вачэй, рота, а крыху ніжэй – рук. На галаву надзявалі вядро, ў рукі давалі сапраўдную касу. Для гэтай ролі выбіралі дужага хлопца, бо ўвесь час ёй павінен быў размахваць ёю, наводзячы страх на ўсіх прысутных. У пару да “смерці” ставілі “чорта”, якога апраналі ва ўсё чорнае, мацавалі на галаву невялікія рожкі, а ў рукі давалі мятлу-дзяркач. Гэтым дзеркачом “ён то снежную хмару падымаў, то мёў пад нагамі, то падымаў уверх і махаў. Таксама пужаў сваім выглядам. Імітаваў коніка – скакаў на дзеркачы” [4].

Як сцвярджае даследчыца беларускай спадчыны Р. Гамзовіч, “кожная вуліца мела свой традыцыйны гурт, а яшчэ шмат дзяцей і дарослых ходзяць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад хаты да хаты, каб павіншаваць усіх гарадчукоў. Падыходзячы да хаты, трэба спытацца, ці можна шчадраваць. Але склалася такая сістэма: калі ў хаце нехта хворы або жалоба па памерлым, яны не маюць права весяліцца і прымаць віншаванні, таму такія сем'і і тыя, хто не хоча прыняць конікаў, выключаюць святло. Калі святло гарыць, шчадравальнікі смела ідуць да хаты. Конік першым падыходзіць да вакна, за ім ідуць іншыя традыцыйныя персанажы свята Шчадраца" [5].

Гурт "Конікі" падыходзіў да чарговай хаты, станавіўся пад вокнамі і пачынаў спяваць песні, якія называлі "шчадроўкамі". Потым звычна віншавалі гаспадароў з Калядамі, жадалі ўсяго найлепшага, а на заканчэнні абавязкова прыгаворвалі магічныя словы: "коб за год дождалі", г.зн. каб праз год абавязкова сустрэліся зноў. Зайсці ў хату дазвалялася толькі "Скарбніку", яшчэ аднаму абавязкова ўдзельніку гурта (як правіла, гэта быў самы паважаны ўдзельнік гурта і самы старэйшы па ўзросце). Ён атрымоўваў ад гаспадароў хаты "узнагароджанне" за віншаванні і пажаданні калядныя прысмакі: каўбаса, шматок сала, пірагі, бутэлька гарэлкі і невялікія грошы.

По словах Р. Гамзовіч раніцай гурт вяртаўся ў тую хату, у якой пераапраналіся, далей "…скарбнік дзяліў грошы, каўбасы і іншыя дары. Давалі па 10, 20 капеек, а кожны за ноч зарабляў рублі 3. У Давыд-Гарадку ў конікаў пераапраналіся сталыя мужчыны, але не старыя – 30-40 гадоў. Маглі быць трохі старэйшыя і трохі малодшыя… Гэты вечар для іх сапраўды шчодры і прыносіць надзею на тое, што і ў новым годзе дабрабыт, мір і шчасце будзе панаваць у іх старажытным гарадку" [5].

Такім чынам, абрад "Конікі", самабытны, напоўнены глыбокім сімвалічным зместам, які  і сёння існуе на Берастейшчыне, сапраўдны культурны здабытак, пласт культурнай спадчыны не толькі аднаго рэгіёна, але і ўсёй краіны. Сучасным фалькларыстам, этнографам, рэжысёрам фальклорных і тэатралізаваных абрадаў і свят неабходна прыкласці усё намаганні, каб захаваць яго ў першасным выглядзе, далучаць моладзь да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтай традыцыі, каб захаваць яе на доўгія гады для наступных пакаленняў беларусаў.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / уклад., класіф., сістэм. матэр. і камент. А.І. Гурскага; уступ. арт. А.І. Гурскага, А.С. Ліса. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

2. Зімовыя святы / А. В. Катовіч, І. І. Крук. – Мінск : Маст. літ., 2004. – 119 с.

3. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 4: Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1 / В.І. Басько [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2008. – 559 с.

4. Абрад "Конікі" [Электронный ресурс]. – Режим доступа http://livingheritage.by/events/694/ Дата доступа: 09.11.15

5. Будзьма беларусамі! Калядны карнавал "Конікі" у Давыд-Гарадку [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу - https://budzma.by/news/kalyadny-karnaval-koniki-w-davyd-haradku-fotarepartazh.html Дата доступу: 15.01.15

Симоненко Д. А., студент 111 группы
Научный руководитель – Барма О. А., старший преподаватель

## МЕНЕДЖЕР – ПРОФЕССИЯ ВЫДАЮЩИХСЯ УПРАВЛЕНЦЕВ

Для понимания статуса профессии «менеджер», необходимо ответить на вопрос: «Кто такой менеджер как субъект управленческой деятельности?».

Термин «менеджер» произошел от английского слова «manager» – «управлять, заведовать, стоять во главе, справляться» [1]. В теории менеджмента квалифицированный менеджер – это начальник, администратор, руководитель, распорядитель, управленец. Основная задача менеджера — управление основными процессами, происходящими как в организации, в

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ